ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 102 (1069) | НЯДЗЕЛЯ, 4-га мая 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Кошт асобнага №—2кап.



1-е мая за мяжою

# РЭВОЛЮЦЫЙНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ АЎЛАДАЎ ВУЛІЦАЙ

**Шматтысячныя баявыя пролетарскія калёны вышлі пад ленінскімі сьцягамі Комінтэрну продэманстраваць сваю гатоўнасьць да барацьбы з капіталізмам, за СССР, за сусьветную пролетарскую рэволюцыю**

**Рабочыя капіталістычных краін, працоўнае сялянства і прыгнечаныя народы калёній і паўкалёній пад кіраўніцтвам компартый з рашучасьцю выступілі супроць крывавых катаў--імпэрыялістых і іх прыслужнікаў**

## Рабочыя раёны і ваколіцы Варшавы былі падобны на ўзброены лягер

ВАРШАВА, 2. Ня гледзячы на мобілізацыю ўсіх паліцэйскіх сіл, ня гледзячы на нячуваныя па сваіх памерах прадмайскія арышты і на адкрытыя пагрозы кулямётамі і бомбамётамі, паліцыі не ўдалося сарваць рэвалюцыйных першамайскіх выступленьняў. Па паведамленьнях друку, дэмонстрацыі адбыліся ва ўсіх асноўных рабочых цэнтрах Польшчы. Рабочыя, даючы адпор узброенай з галавы да ног паліцыі, адстаялі свае права на вуліцу. Рабочыя раёны і ваколіцы Варшавы 1 мая былі падобны на ўзброены лягер. Паліцыя прыведзена ў баявую гатоўнасьць: паліцэйскія рэзэрвы з провінцый былі сьцягнуты ў Варшаву.

З найбольш буйных дэмонстрацый у Варшаве трэба адзначыць дэмонстрацыю ў раёне фабрыкі „Паравоз“, у якой удзельнічала каля 2000 чалавек. Паліцыя разганяла дэмонстрантаў голымі шаблямі. Рабочыя пусьцілі ў ход каменьні.

## 200.000 чалавек дэмонстравалі ў Бэрліне

БЭРЛІН, 1. Агульная колькасьць удзельнікаў дэмонстрацыі компартыі і рэволюцыйнай профопозыцыі ў Бэрліне складае 200.000 чалавек, з іх каля 120.000 прыходзіцца на дэмонстрацыі ў Люфтгартэне з тае прычыны, што і ў Люфтгартэне не маглі зьмясьціцца ўсе жадаючыя, дык многія дзесяткі тысяч рабочых перапоўнілі ваколічныя вуліцы.

Уся частка пролетарскага мітынгу ўяўляла сабою вялікае мора чырвоных сьцягоў і плякатаў. Ня было амаль што ніводнага дому, ня ўпрыгожанага чырвонымі сьцягамі. Папярок вуліцы былі працягнуты чырвоныя палотнішчы з рэволюцыйнымі лёзунгамі. Бясконцыя калёны дэмонстрантаў на чале з членам ЦК компартыі Фэльдманам і Найманам праходзілі скрозь калёны рабочых, дзе выкрыкваліся: „Няхай жыве компартыя“, „Няхай жыве СССР“, „Няхай жыве Комінтэрн“.

## У Токіё арыштавана каля 400 трамвайшчыкаў

ТОКІЁ, 2.—Напярэдадні 1-га мая паліцыя арыштавала ў Токіё 200 левых дзеячоў. У адбыўшыйся 1-га мая дэмонстрацыі профсаюзаў удзельнічала 15 тысяч чалавек. На працягу ўчарайшага дня ў розных пунктах Токіё арыштавана каля 400 чалавек трамвайшчыкаў, якія кінулі працу, жадаючы ўдзельнічаць у дэмонстрацыі. Яны імкнуліся па сканчэньні працы прабрацца ў муніцыпалітэт, але былі разагнаны паліцыяй. Першамайскія выступленьні падобна токійскім адбыліся ў Кобэ, Іокогаме, Кото, Кіушыу і інш. мясцох. Агульны лік удзельнікаў па ўсёй краіне складае каля 100 тысяч.

## Паліцыя пусьціла ў ход гумовыя палкі

РЫГА. 1.—Паліцыя і ахранка яшчэ з ўчарашняга вечару былі прыведзены ў баявую гатоўнасьць. Спробы рэволюцыйных рабочых дэмонстраваць спыняліся сілай. Усіх супраціўляючыхся паліцыя зьбівала гумовымі палкамі і арыштоўвала. Лічба арыштаваных у Рызе перавысіла 200 чалавек. Кожнаму дэпутату рабоча-сялянскай фракцыі прадстаўлены па два агенты ахранкі, якія хадзілі па пятах. На дзённым мітынгу соц.-дэмократы і паліцэйскія зьбівалі і арыштоўвалі ўсіх рабочых, якія выказвалі сваё нездавальненьне здрадніцкай тактыкай латвійскай соц.-дэмократыі.

# ПЕРШАЕ МАЯ У МАСКВЕ

МАСКВА, 2. 1-га мая ў Маскве на Чырвонай Плошчы адбыўся парад вайсковых частак і дэманстрацыя працоўных. Трыбуны займалі госьці, прадстаўнікі Комінтэрну, замежных рабочых і дыплёматычны корпус. А 9-й гадзіне на ўрадавай трыбуне зьяўляюцца т. т.: Калінін, Сталін, Рудзутак, Мікаян, Енукідзе, Молатаў, Кагановіч, Орджанікідзе, Куйбышаў, Яраслаўскі, Рыкаў і інш. Раздаюцца аглушаючыя гукі вайсковых оркестраў, з варот Крамлю верхам выяжджае тав. Варашылаў. Войскі вітаюць тав. Варашылава бурнымі крыкамі ура. А палове 10 тав. Калінін адчыняе дэмонстрацыю. Слова даецца тав. Варашылаву, які пасьля прывітаньня зачытвае прысягу. Словы прысягі хорам паўтараюцца стройнымі радамі маладых чырвонаармейцаў. Пачынаецца ўрачыстая дэмонстрацыя чырвоных частак. Праходзіць корпус ТДА-Авіяхэму, складзены з піонэрскіх і комсамольскіх сан. вайсковых частак самакатчыкаў і рабочых частак у скураных тужурках і процівагазах. Грукаюць гусеніцы магутных трактароў, цягнуцца пляцформы з аружжам. Павольна праходзіць танкавы полк. Дэмонстрацыю ваенных частак замыкае хутка праехаўшы атрад тачанак і кавалерыйскія часткі. Апошняе ўра кавалерыстых заглушыў шум самалётаў, павольна праляцеўшых над Чырвонай Плошчай. З 12 гадзін Чырвоная плошча запоўнілася магутнымі людзкімі хвалямі, сьцягамі, лёзунгамі і карыкатурамі. Пачалася дэмонстрацыя працоўных Масквы. У першых шэрагах дэмонстрацыі ішлі дэлегацыі рабочых Захаду і Ўсходу, пад гром апплёдысмэнтаў прайшоў атрад нямецкіх чырвоных франтавікоў. Рабочыя калёны заводаў і фабрык нясуць на плякатах лічбовыя паказальнікі выкананьня прамфінпляну, красуюцца карыкатуры на папу і Пілсудзкага— падпальшчыкаў новай вайны супроць СССР. У шматлікіх лёзунгах працоўныя Масквы заяўляюць, што дадуць рашучы адпор папам усіх масьцей і іх гаспадарам капіталістым, якія падрыхтоўваюць крыжовы паход супроць СССР. У гэтым годзе ўпяршыню дэмонстравалі калёны калгасьнікаў, выяўляючыя яднаньне колектывізуючай вёскі з пролетарскім горадам. Адзінадушны протэст дэмонстрантаў выклікаў нядаўні замах на выбух савецкага прадстаўніцтва ў Варшаве. Вечарам шматлікія натоўпы народу запоўнілі залітыя электра-ільлюмінацыяй вуліцы, тэатры і кіно. У першамайскай дэмонстрацыі ў Маскве ўдзельнічала больш мільёну працоўных.

## Канфіскован спэцыяльны нумар „Юманітэ“

ПАРЫЖ, 1. Напярэдадні 1 мая паліцыя конфіскавала спэцыяльны нумар органу компартыі „Юманітэ“ і першамайскія выданьні компартыі. Былі арыштаваны 22 замежныя дзеячы компартыі. 30 чалавек было арыштавана за распаўсюджваньне лістовак. У шмат якіх парыскіх ваколіцах адбіліся сутычкі між дэмонстрантамі і паліцыяй. Утвораны шматлікія арышты.

## На Чырвоным Пляцу ў Маскве



1-ае мая 1930 году ў Маскве было адзначана грандыёзнай дэмонстрацыяй на Чырвоным ПляцУ.
НА ЗДЫМКУ: 1) Урадавая трыбуна. Тав. Варашылаў агалашае ўрачысты зварот. 2. Агульны від вайсковага параду на Чырвоным Пляцу.

# Першамайскія дні ў Менску

Вечар. 30 красавіка. Менск у электрычнасьці.

Лямпачкі Ільліча рознымі фігурамі, зігзагамі ўбралі памяшканьні і вуліцы Менску.

Сьцягі.

Адчуваецца вялікая бадзёрасьць і надзвычайнае ажыўленьне.

У клюбах урачыстыя пасяджэньні.

У Доме Культуры ўрачыстае пасяджэньне Менскага Гарадзкога Савету, прысьвечанае Першамаю.

Рабочыя рапартуюць гарадзкому савету: колькі імі кінута брыгад у вёскі па рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, як вядзецца шырокая культурна-масавая работа, аб удзеле рабочых ва ўсім будаўніцтве.

***

1-га мая раніцаю вуліцы Менску жывуць урачыстасьцю. Калёны рабочых з заводаў і фабрык, комсамольскія організацыі, профсаюзы,



НА ЗДЫМКУ: зьлева направа: т. т. Калнін (Старшыня ЦКК КП(б)Б і НКРСІ), Ягораў (Камандуючы Беларускай Вайсковай акругай) і Васілевіч (сэкратар ЦК КП(б)Б.

Старшыня ЦВК тав. Чарвякоў у сваім вялізарным дакладзе глыбока ахарактарызоўвае становішча, пры якім праходзіць сьвята ў краіне саветаў, дзе будуецца соцыялізм і там, за межамі, дзе яшчэ пануе капіталізм.

— Капіталістычны сьвет—кажа тав. Чарвякоў—усё больш і больш уступае ў глыбокую паласу крызісу. Крызіс цяпер зьяўляецца агульным для ўсіх капіталістычных краін.

Рабочы рух з нябывалым напружаньнем і ўздымам рэволюцыйнай барацьбы і загартаванасьці ўступае ў новую і новую паласу. Лік забастовак з кожным днём павялічваецца. Пролетарыят усяго сьвету няспынна вядзе барацьбу з капіталам, разьбіваючы путы адвечнай прыгнечанасьці.

Ад кіеўскай дэлегацыі прадстаўнікі рабочых на сваёй нацыянальнай украінскай мове вітаюць пролетарыят Менску, запэўніваючы, што пролетарыят Савецкай Украіны будзе ісьці і надалей у нагу з усім пролетарыятам Савецкага Саюзу ў барацьбе за соцыялізм.

Адзін за адным зьяўляюцца на сцэну прадстаўнікі заводаў і фабрык Менску, рапартуючы аб сваіх дасягненьнях па пытаньню выкананьня 5-годкі ў чатыры гады, па выкананьню прамфінпляну. Паказчыкі лічбаў сьцьвярджаюць аб тэй надзвычайна вялікай справе, якая разгарнулася па будаўніцтву соцыялістычнай бацькаўшчыны.

фізкультурнікі з сьцягамі і лёзунгамі, плякатамі сьцягваюцца да вызначаных месц.

9 гадзін.

На Савецкай і Ленінскай вуліцах, на пляцы Волі—тысячы дэмонстрантаў.

Оркестры.

Вясёлыя, бадзёрыя, магутныя песьні, лёзунгі, прывітаньні стварылі магутны дынамічны рытм.

Чырвоны Менск сёньня жыве першамайскімі бадзёрымі настроямі.

Роўнымі, цьвёрдымі крокамі ідуць непераможныя шэрагі чырвонай коньніцы, пяхоты, тэхнічных войск, ідуць атрады ТДА-Авіяхіму.

Тысячы сьцягаў уставілі вуліцы.

Плякаты, лёзунгі, поўныя жывых, заклікаючых момантаў жыцьця і будаўніцтва.

***

Назаўтра... урачыстае сьвяткаваньне працягваецца. Піонэры і школьнікі дэмонструюць па вуліцах.

Рабочыя прадпрыемстваў, працоўныя іншых устаноў сёньня выехалі ўсе ў колгасы да сваіх падшэфнікаў для правядзеньня сумеснага сьвяткаваньня.

Вечарам...

Клюбы, кіно, тэатры перапоўнены... працуюць па баявому, абслугоўваючы працоўных.

Я.

## У Ленінградзе

ЛЕНІНГРАД. 1-га мая на плошчах Урыцкага і Ахвяр рэволюцыі адбыўся парад чырвоных частак і працоўных. Парад прымалі т.т. Кіраў, Чудаў Аляксееў, а таксама Макс Гельц, член ЦК польскай компартыі Бітнэр і прадстаўнікі эстонскага і кітайскага пролетарыяту. Дэмонстрацыя прайшла пад лёзунгамі выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады і ўмацненьня Чырвонай арміі. Упяршыню выступалі „падарункі“ 1-му мая: алюмінавы завод, фабрыка кухня і інш., толькі што пушчаныя ў ход заводы. У шматлікіх карыкатурах асабліва „пашанцавала“ папе рымскаму —рэлігійнаму падпальшчыку новай вайны супроць СССР. Дэмонстрацыя адзначалася нябывалай масавасьцю. У ёй прымала ўдзел каля мільёну чалавек.

Да пленуму ЦК ЛКСМ

# ГАРАЧЫЯ СЛОВЫ, РЭЗОЛЮЦЫІ, ЗАГАДЫ

## ні ў якім разе не забясьпечаць рашучага павароту работы ўсёй вясковай комсамольскай арганізацыі адпаведнасьці з задачамі соцыялістычнай перабудовы вёскі

**Патрэбна:** неадкладная мобілізацыя батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі, жывое конкрэтнае кіраўніцтва зьмены мэтаў і форм масавай работы ў адпаведнасьці з тэмпамі колектывізацыі і, на аснове яе,—ліквідацыі кулацтва як клясы.

*АБГАВАРВАЕМ ЛІСТ ТАВ. ПАВАРОТНАГА*

## Ня звужаць задач работы комсамольскіх ячэек у колгасе

Абгаварыўшы артыкул Зьмітрака Паваротнага з яго кніжкі **„Комсамольцы ў колгасах›** („Чырвоная зьмена №№ 61, 62) лічым неабходным зазначыць наступнае: зусім своечасова „Чырвоная Зьмена“ узьнімае пытаньне аб рабоце комсамольскіх ячэек у колгасе.

Структуру пабудовы нізавых комсамольскіх організацый у колектывізаваных раёнах неабходна зьмяніць прыстасаваць яе да ўмоў колгасу.

Асобныя заўвагі на кніжцы Паваротнага:

Па-першае я лічу, што кожны месяц патрэбна склікаць нарады комсамольцаў, вылучаных на тую ці іншую галіну працы. Бюро комсамольскага колектыву даваць дырэктывы на падставе справаздач асобных сэкратароў—немагчыма, а пагэтаму ў бюро-колектыве трэба каб былі адказныя за асобныя галіны работы, якія будуць праводзіць і кіраваць нарадамі, (піонэр-нарада, культмасавая, эконом. і г. д.)

Па разьдзелу **„Стрыжневыя пытаньні колгаснай ячэйкі“**, чыста гаспадарчыя пытаньні: 1. Організацыя вытворчасьці працы ў колгасах; 2. Правільная мэтазгодная організацыя рабочай сілы; 3. Павышэньне продукцыйнасьці працы; 4. Сыстэма аплаты працы колгасьнікаў; 5. Далейшае абагуленьне асноўных сродкаў вытворчасьці і павялічэньне непадзельнага капіталу. Гэта правільна, але—ня вычэрпваючы стрыжневых пытаньняў, патрэбна максымальна разгарнуць соц. спаборніцтва, зрабіць яго мэтадам гэтай працы, весьці працу сярод акаляючых вёсак, аб організацыі колгасаў і практычна дапамагаць ім у рабоце.

Па разьдзелу „ліквідацыя колгаснай і агро-тэхнічнай няпісьменнасьці“—пытаньне вельмі сужаецца. Тав. Паваротны хоча чытаць і газэты па колгаснаму будаўніцтву, праводзіць кніжныя „эстафеты“, а незварачваючы ўвагі на тое, што маецца вялікая колькасьць комсамольцаў, якія зусім няпісьменныя (асабліва батракі, беднякі). Па гэтаму трэба сыстэматычна ліквідаваць няпісьменнасьць, ня толькі па колгаснаму будаўніцтву, а наогул па пытаньнях політыкі партыі на вёсцы і іншых політычных пытаньнях.

Па разьдзелу „культ. бытавая работа“ мы-б дабавілі,—культбытавая і масавая работа як быццам-бы „комсамольцы ў колгасах павінны абавязкова дабіцца організацыі дзіцячых ясьляй і пляцовак—асноўная задача культмасавай працы ячэяк КСМ“.

Ну, што-ж даб'юцца, організуюць ясьлі, пляцоўку і... усё, больш працы няма. Ленін гаварыў:—**„Мы ўзялі экономічна, але галоўны гвозд, нам не дастае культуры“**. Культ. бытавая работа на сёньняшні дзень зьяўляецца адной з актуальнейшых пытаньняў комсамольскай працы ў вёсцы. Тут комсамольскі колектыў (цэхавая ячэйка) павінны правесьці шырокую работу па выкорчваньню тых старых традыцый, якія захаваліся да сучаснага моманту.

Цяпер зачастую моладзь ня ідзе ў колгас, а ёсьць выпадкі, што выходзіць таму, што для яе няясна:—„Як быць з шлюбам, з прыданым. Ці ня прыдзецца спаць пад агульнай 24-мэтровай коўдрай! і г. д.“ Гэтыя кулацкія песьні патрэбна разьбіць зброяй культ. масавай работы. Моманты анты-рэлігійнага інтэрнацыянальнага, палавога выхаваньня павінны заняць адно з першых месц комсамольскай работы. У колгасе павінна выпускацца адна—агульная колектыўная насьценгазэта, якая павінна зьяўляцца люстрам колгаснага жыцьця і быць яго арганізатарам. Трэба з'організоўваць курсы па павышэньню тэхнічнай адукацыі, па падрыхтоўцы батракоў, беднякоў,—колгасьнікаў да паступленьня ў сярэднюю і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Па аддзелу „аб нагрузках“. Гэта праўда, што „колькі ня крычалі мы аб роўнамерным разьмеркаваньні нагрузак сярод комсамольцаў, а карысьці ад гэтага мы маем яшчэ мала“. Пакуль ня будзе практычных вузораў гэтай работы. Агітаваць мала, тут неабходна скарыстаць вопыт некаторых комсамольскіх ячэек, для чаго зараз-жа пачаць асьвятленьне і абгаварэньне на старонках „Чырвонай Зьмены“ аб найлепшай пастаноўцы працы ў колгасах і роўнамерным разьмеркаваньні нагрузак паміж комсамольцамі.

Комсамольскую ячэйку ня трэба браць ізолявана. Тут павінна быць цесная сувязь і дагаворанасьць з мясцовымі організацыямі, як парт. ячэйкай, пад кіраўніцтвам якой павінна працякаць уся работа комсамольскай ячэйкі—колектыву; сельсаветам, праўленьнем колгасу, профячэйкамі і іншымі організацыямі.

Бязумоўна, што гэта ня будзе вычэрпваючым матар'ялам, але галоўнейшая канва, па якой павінна накіравацца праца комсамольскіх ячэек.

З астатнімі меркаваньнямі аўтара можна згадзіцца,

**А. Пялінскі.**

## Крупіцы каштоўнага вопыту асобных ячэек

### зрабіць здабыткам усёй організацыі

Ліст Паваротнага, даючы напрамак перабудовы працы ячэйкі і РК да задач разгорнутага соцбудаўніцтва на вёсцы на базе суцэльнай колектывізацыі дае ў асноўным правільны напрамак.

Задачы перабудовы комсамольскай работы ў адпаведнасьці з сучаснымі задачамі паўсталі надзвычайна востра. У асобных мясцох мы ўжо маем некаторыя дасягненьні, але гэтыя крупіцы часта невядомы ўсяму комсамолу, у даным выпадку я хачу падзяліцца маленькім вопытам, які маецца ў нас у справе перабудовы комсамольскай работы. Так. Юзотаўская ячэйка праводзячы падрыхтоўку моладзі, батрацтва, бедноты да арганізацыі колгасу, наладжвала вечары з сялянамі, на якіх разьбіралі колгасны статут і чыталі колгасную літаратуру, прапрацоўвала на агульных сходах ячэйкі з моладзьдзю і сялянамі пытаньні лепшай організацыі колгасаў, у выніку гэтай працы—уся вёска ўступіла ў колгас. старшынёй якога абралі комсамольца. Комсамольцы Юраўскай ячэйкі першымі выступалі за колектывізацыю на сходах бедноты сялян, разьмеркаваўшыся па брыгадах зрабілі абход кожнага сялянскага двара, праводзілі гутаркі аб карысьці колгаснага будаўніцтва,—і ў выніку ўсе 100 проц. двароў увайшлі ў колгас, старшынёй таксама абраны комсамолец.

Ячэйкі вёскі Клянікі і колгасу „Комсамольская Воля“, разьмеркаваўшыся на ўдарныя групы, абралі кіраўнікоў і правялі па вёсках сходы бядняцка-батрацкай моладзі і жанчын па падрыхтоўцы да організацыі колгасаў, а пасьля кожны вечар сыстэматычна праводзілі працу з актывам вёскі. Комсамольцы гэтых ячэек былі застрэльшчыкамі організацыі ўдарных груп з дарослых па організацыі колгасу, і, калі організаваўся колгас аб'ядноўваючы ўвесь сельсавет, старшынёю і намесьнікам яго абраны актыўныя комсамольцы. Прыклады працы гэтых ячэек даюць яскравы малюнак таго, як ячэйкі здолелі перабудаваць сваю працу ў адпаведнасьці з задачамі гаспадарчага будаўніцтва ў колгасах. Гэтыя ячэйкі паказалі сваю згуртаванасьць, уменьне з'організаваць батрацтва і бедноту і ў час раскулачваньня.

Ячэйкі, здолеўшыя перабудаваць сваю работу і прыцягнуць моладзь да актыўнага ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве колгасу, маюць значны рост за лік бедноты і батракоў колгасаў. Ячэйка „Новае Жыцьцё“ прыняла 15 чалавек, „Полымя“—14, „Праца“—10 і організавалі 3 новыя ячэйкі. „Чырвоны Кастрычнік“—20 чалавек, „Зорка“—16, „Гудок“—15. Гэты маленькі вопыт працы асобных ячэек, які даў такі значны вынік, ставіць задачу неабходнасьці карэннай перабудовы форм і зьместу працы ўсёй організацыі паводле закранутых артыкулам Паваротнага пытаньняў. Я лічу, што ў галіне оргпабудовы неабходна організацыя куставых колектываў. Гэта палепшыць кіраўніцтва і практычную працу ячэек. Куставы колектыў зможа хутка орыентаваць цэхячэйкі на чарговыя пытаньні колгаснай працы, дапамагчы ячэйкам практычна організаваць комсамольцаў на іх выкананьне, таксама увязацца з асаблівасьцямі працы ўсяго куста.

Толькі неабходна будзе ў некаторыя куставыя колектывы нуць раённы актыў і падаб лепшых організатараў з батр і беднякоў.

Лічу неабходным каб у ўваходзілі таксама і сав ячэйкі,—адрозьніваць іх не згодна. Райком, бязумоўна, нен кіраваць ячэйкамі савгасу і цэхячэйкамі колгасу, хоць лоўная задача кіраўніцтва і тычная дапамога будзе за вым колектывам.

Працу колгасных ячэек на жэйшы час мы павінны накір на організацыю сапраўднага гортваньня соцыялістычнага борніцтва і ўдарніцкага рух колгасах, на замацаваньне су, на барацьбу за падвышэ ураджайнасьці, продукцыйн працы і інш. ячэйка павінна мацца ўсімі пытаньнямі жы колгасу, організоўваючы і пра чы ня толькі з комсамольцамі, ўцягваючы ў актыўную працу батрацка-бядняцкую і серадня моладзь праз ударныя бры соцспаборніцтва, вытворчыя ды і „Лёгкую Кавалерыю“, уц ючы ўсю грамадзкасьць колг культурна-бытавое будаўн яго, якое павінна стаць неад'е часткай працы ячэйкі комсамо

Перабудова працы комса скіх ячэек неабходна паднача больш пасьпяховай соцыялісты перабудове вёскі і ўнутры-ко наму будаўніцтву.

МАРКЕВ



**Колгасьнікі перад выяздам у поле**

## Куецца новы чалавек

Яшчэ ў лесе ляжыць белымі плямамі нерастаўшы сьнег. Вазёры ня ўсюды вызваліліся ад рэштkaў зімовых акоў. Яшчэ не паказала вясна свайго зялёнага адзеньня, не расчыніліся ліпкія пахучыя пучкі топалю і ліпы. Не разгарэлася вясна ў сваім харастве. Але надышла вясна бальшавіцкая.

Колгасная маса не пажадала чакаць на дзедаўскія звычаі і іх тэрміны. На колгасныя палі выступілі чырвоныя паходы, калёны са сьцягамі, музыкай, гарачымі прывітаньнямі. Зрабілі першыя выхады ў поле, пачалі падымаць яравы клін, зьнішчаць векавыя межы—вінавайцаў сялянскай галацьбы, цемры.

Запытайцеся ў калгасьнікаў „Чырвонага Сьцягу“ ці лепш жывецца ў колгасе. Вам атказа ня толькі колгасьнік старога, з 22-га году, колгасу, які на былой панскай зямлі склаўся з сямі гаспадарак, вам адкажа колгасьнік ужо пашыранага ў 1930 годзе колгасу—з 100 гаспадарак: „Мусіць лепш, калі мы дзесяткамі ўліліся ў яго“.

Колгас хоць і перажыў за 8-гадовае існаваньне шмат прарываў і цяжкасьцяй, але справа паказаў пераважнасьць колгаснае гаспадаркі над індывідуальнаю «душагубкаю» (як адзін стары казаў)—тут усе разам, адзін за аднаго, ня так, як у індывідуальных раздробленых гаспадарках.

Вось, паглядзеце! Па суседству—хутары вёскі Шалахваны. Сёньня там беднота і частка серадняцтва, пераканаўшыся ў пераважнасьці колектыўнай гаспадаркі, сабралася на сход і змагаецца з рэшткамі спадчыны мінулага.

На сходзе з усёй яскравасьцю вырысоўваюцца два лягеры: бядняк, які пераканаўся ў тым, што толькі адзін шлях палепшэньня яго жыцьця ёсьць колектыўная соцыялістычная гаспадарка, серадняк, які асноўнай масай рушыўся за бедняком, і другі лягер—кулак і падкулачнік, выступаючы яра супроць колектывізацыі. Пасьля доўгіх спрэчак аформілася аддзяленьне колгасу з 11 гаспадарак, а к канцу сходу прыбавіўся яшчэ адзін чырвоны партызан, які ў свой час не баяўся ні кулі, ні сьмерці, зараз перамог хістаньні, прычыны, якія ляжалі ў тым, што „жонка крычыць“. Назаўтра, калі аддзяленьне вышла ў поле, далучылася яшчэ пара гаспадарак, якія яшчэ ўчора хісталіся.

А зараз ідзе брыгада за брыгадай: спачатку плугары, потым баронщыкі. Са сьмехам, вясёлымі, бадзёрымі сьпевамі працуюць колгасьнікі і колгасьніцы—дзяўчаты, падбіраючы каменьні. Паркі з сакоўскімі плугамі па-баявому, па-ўдарнаму, адзін за адным, узьнімаюць цаліну, зьнішчаюць спрадвечныя межы.

Разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцкі рух, якія ахапілі ня толькі комсамольцаў, моладзь, але і ўсіх дарослых колгасьнікаў,—зьяўляюцца магутным сродкам мобілізацыі энэргіі мас колгасьнікаў на пасьпяховае вырашэньне задач соцыялістычнага будаўніцтва, давядуць і запэўняць і тых, хто хістаецца ў пераважнасьці колектыўнай гаспадаркі.

Гэта толькі маленькая горстачка фактаў, якія гавораць аб вялікім творчым уздыме, вялікім энтузіязьме колгасьнікаў. Пад кіраўніцтвам партыі комсамол, батрацтва і беднота, у саюзе з серадняком, актыўна змагаюцца за лепшае жыцьцё. У зьвязку з гэтым, зусім нечакана, за адзін дзень першай працы колгасьнікаў у полі, паступілі ў колгас імя Леніна 24 заявы, „Новай Зоркі“—20, у „Камень“—10. Пад кіраўніцтвам партыйцаў і комсамольцаў ударнікі разьбіваюць старыя ўстоі, у старой рабаўласьніцкай вёсцы выкоўваецца новы чалавек, імя якому калгасьнік.

**Усьмінскі.**

## Ня так змагацц

*Комсамольская ячэйка печыц, Ракаўскага с.-с., леўскага раёну зусім не малася антырэлігійнай цай. Ячэйка не разгар ніякай антырэлігійнай паганды, каб выкрыць вар твар рэлігіі, а замест гэт комсамольцы прышлі ў цар Лізершчына і пачалі вык іконы.*

*У царкве ляжалі мо былога „караля“, яны яго крылі, косьці і галаву наб на палкі і кідалі адзін у нага. „Ініцыятарам“ гэ справы быў* **Кандрацёнка** *зыль і некаторыя іншыя.*

*У кутку царквы зна сумку з патронамі. Але н дома куды іх дзелі. А ці патрэбна было-б разгля гэту справу, як папалі троны ў царкву і хто з ваў гэтыя патроны?*

*Рэлігія шкодна, і з ёю ба змагацца, але ня так комсамольцы Таўпечыцы. Я цы патрэбна правесьці тлумачальную працу с моладзі аб мэтадах бара з рэлігіяй і падняцьці тэ тычнага ўзроўню мас.*

*Х.*

## Бібліотэка, якою карыстаюцца

У савгасе Палажэвічы, Стар рoскі раён (Бабруйшчына), бібліотэка, але сяляне нікол могуць ёю карыстацца, нікол застанеш бібліотэкара. Кніжкі сама вельмі старыя, не адпавяд задачам колектывізацыі, а на ніхто не зьвяртае ўвагі. Комса ская ячэйка савгасу зусім ня віцца гэтай справай.

**Алесь Марн**

Выездная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ у Віцебску

# НАЦІСНУЦЬ НА УСЕ РЫЧАГІ, КАБ ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН

**пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, канчатковай ліквідацыі прарываў, зьнішчэньня ўсіх перашкод будаўніцтва || Немагчыма пасьпяховае прасоўваньне наперад, да новых перамог у справе соцыялістычнага будаўніцтва**

## ДА ГАНЕБНАГА СЛУПА ЗРЫВАЮЧЫХ ВЫКАНАНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ!

## ...бутковая ім. Лекерта ...зьнішчыла прарываў

...бутковая фабрыка імя Лекерта ...цебск) прамфінпляну ў першым ...ртале ня выканала. За першае ...годзьдзе програма выканана ...ькі на 83,8 проц. Недавыпушча... продукцыі на 589200 рублёў.

...бекошт у 1-ым квартале зьні... замест 7 проц., толькі на 5 ...оц., а за студзень і люты месяц ...іжана на 10 3 проц. замест 14, ...ечаных прамфінплянам.

...сьць вялікая разьбежка паміж ...там продук ыйнасьці працы і ...платы. Калі ў студзені і лютым ...навае заданьне па росту про...цыйнасьці працы было перавы...нана на 2,8 проц., дык па зар...це перавыканана на 13,3 проц. ...обра абстаіць справа і з бра... У 1-м квартале брак дасягаў ... проц., а у студзені і лютым ... проц. Ударніцтвам ахоплена ... проц. рабочых. Комсамольцы ...ртыйцы ахоплены ўдарніцтвам ...ўсе 100 проц.

...рганізацыя фабрыкі ня кіруе ...рніцтвам. Вытворчая камісія ...іць моцным сном. Прапановы ...очых не праводзяцца ў жыцьцё. Кіраўніцтва фабрыкай з боку ...рэкцыі і тэхнічнага пэрсоналу ...скае. Напрыклад, рантовачнаму ...у прышлося стаяць два дні без ...оты з-за няправільнай паста...ўкі працы у цэху, а таксама з-за ...адрыхтоўкі кваліфікаванай ра...ай сілы і агіднага забясьпе...ньня фабрыкі паўфабрыкатам з ...у Віцебскага скурзаводу.

...абочыя фабрыкі зьвярнуліся да ...рэктара і тэхнічнага пэрсо...у, каб яны на гэта рэагавалі. ...атрымалі адказ: „ідзеце на ...е месца і патрабуйце аплаты ...два дня прастою“,—такім чы..., ня было выпушчана каля ...ачы пар абутку. Нягледзячы ...тое, што фабрыка знаходзіцца ...чорнай дошцы, трыкутнік фаб...кі не пастараўся мабілізаваць ...очыя масы на ліквідацыю пра...аў у выкананьні прамфінпляну. ...рэкцыя і тэхнічны пэрсонал не ...рачае ніякай увагі на становіш... фабрыкі.

ЛЕЎШАНКА.

## ...сапраўды, не рабецеся ...надта „вумнымі“, тава...шы з завкому „Чырвонага Мэталістага“

...рабоце ФЗВ заводу „Чырвоны ...алісты“ ёсьць шэраг недахопаў ...аат бясчынстваў. Вучні каля ...месяцаў працуюць па адным і ...-жа разрадзе. Загадчык ФЗВ ...таякоў адмаўляецца ад пераво...вучняў у другі разрад, як-бы ...адсутнасьці сродкаў. У май...рнях не хапае інструмантаў. ...ары, кавалі і ліцейшчыкі не ...ымалі акуляраў, з-за чаго зда...ца шмат няшчасных выпадкаў. ...ейшчыкі не атрымоўваюць мала...у часе адліўкі.

...калі комсамольская ячэйка і вуч...скі камітэт аб усім гэтым па...ілі пытаньне перад заводзкім ...мітэтам, дык ім сказалі: „Не рабецеся вумнымі“.

Гордзін.

## 3 пал. месяцы чакаем абяцанага

...у часе правядзеньня тыдню „тэх...а—масам“ інжынэр заводу тав. ...мовіч узяў на сябе абавязацель...а шэфстваваць над адной з удар...х брыгад. **З таго часу прашло ...ю два з паловай месяцы** і ні ...жынэр Адамовіч, ні бюро колек...ву не паклапаціліся, каб пра...сьці гэта у жыцьцё.

...брыгады, як і раней, не набыва...ь тэхнічных ведаў.

Комсамолец.

## Рвачы ня могуць быць ударнікамі

*У пачатку разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва між цэхамі дэпо станцыі Віцебск МББ чыгункі быў дапушчан шэраг памылак.*

*Дагаворы між цэхамі і брыгадамі ня мелі дастатковай конкрэтнасьці, а таму ня далі пэўных вынікаў.*

*Комсамольская брыгада на плянава-папярэджальным рамонце ў сваёй рабоце праяўляе яўна рвацкія настроі. Ня гледзячы на тое, што брыгада ўвесь час атрымоўвае вялікі прырабатак, расцэнку зьніжаць і ня думае, а наадварот—дамагаецца, каб яе „паднялі.*

*Ёсьць у шэрагах ударнікаў і такія, што не саромяцца прагульваць (комсамолец* Барысенка*), мыць рукі задоўга да гудка і г. д.*

*Усё гэта можна тлумачыць толькі адсутнасьцю кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі з боку бюро комсамольскага колектыву.*

А.

## 2 брыгады разваліліся...

Комсамольцы ліцейнага цэху першыя адгукнуліся на справу ліквідацыі прарываў, якія завод меў у 1-м квартале. Была створана комсамольская ўдарная комуна, але дзякуючы масавасьці і дрэннаму кіраўніцтву з боку заводзкіх організацый і ячэйкі КСМ, яна ніякіх посьпехаў не дабілася. Уведзеная „ураўнілаўка“ адбіла ўсякую ахвоту працаваць. Некаторыя „комунары“ замест актыўнай работы займаліся курэньнем і пустымі размовамі.

Няўважлівыя адносіны да працы адбіліся на якасьці продукцыі. Брак пачаў павялічвацца. У выніку—комуна развалілася. Комсамольская ячэйка, замест кіраўніцтва гэтай комунай, замазвала яе хворыя бакі. Гэта і зразумела, бо сам сэкратар ячэйкі займаўся рвацтвам і лодырніцтвам. У развале комуны вінавата і адміністрацыя цэху.

Пасьля развалу першай комуны праз некаторы час організавалася другая, але ня ўлічыла памылак першай комуны і таксама развалілася. **Назвіч і Зарагацкі**—галоўныя вінавайцы ў развале комуны.

Брыгада юнкораў „Ч. З.“ | **Чэпікаў Кастамараў Карагін Люгоўскі**

## У вас шмат дэзэртыраў соцспаборніцтва

Комсамольская ячэйка № 1 Віцебскага дэпо МББ чыгункі налічвае каля 35 асоб. Ня ўся ячэйка ахоплена ўдарнымі брыгадамі. Ёсьць комсамольцы, якія зусім не жадаюць удзельнічаць у соцспаборніцтве. Гэтаму спрыяюць таксама і няўважлівыя адносіны кіраўнікоў прадпрыемства да ўдарных брыгад. Прыкладам, ударная брыгада кацельшчыкаў доўгі час не атрымлівала работы толькі таму, што складаецца з вучняў, а яна магла выконваць такую-ж работу, як і дарослыя рабочыя.

З гэтае прычыны заўважаны дрэнныя адносіны да брыгады і з боку дарослых рабочых. Комсамольская ячэйка слаба кіравала і амаль не цікавілася работай ударных брыгад. Тэхнічнага навучаньня сярод ударнікаў не праводзіцца.

Гэтыя недахопы неабходна зьнішчыць для пасьпяховага выкананьня прамфінпляну.

**Ударнік.**

## Ударная кацельная

**На сярэднім рамонце дэпо Віцебск МББ некалькі месяцаў таму назад з'організавалася ўдарная брыгада з маладых рабочых—комсамольцаў.**

**Брыгада за нязначны час сваёй работы мае ўжо значныя дасягненьні. Цягнікі з рамонту выпускаюцца брыгадай своечасова. Спазьненьні і прагулы выжыты. Старыя рабочыя, па прыкладу комсамольцаў-ударнікаў, таксама пачалі організоўвацца ва ударныя брыгады.**

**КОМСАМОЛЕЦ.**



...Пад шопат праводных пасаў ідзе ударная праца...

## Ударныя брыгады на задворках ячэйкі

**(Віцебск, акулярная фабрыка)**

У нас на фабрыцы дрэнна рэагавалі на прарывы 1-га кварталу. Рабочым і работніцам мала растлумачаны задачы і значэньне ўдарных брыгад. Многія комсамольцы і цяпер яшчэ не зьяўляюцца ўдарнікамі. Адно ўжо гэта характарызуе „працаздольнасьць“ комсамольскай ячэйкі.

Інжынэры і тэхнікі ня трымаюць шэфства над ударнымі брыгадамі. Тэхлітаратура не распаўсюджваецца. Перашкаджаюць рабоце ўдарных брыгад і ўнутраныя непаладкі.

Напрыклад, у зборачным цэху комсамольская брыгада аніяк ня можа наладзіць сваю працу дзякуючы няўжыўчывасьці і плёткам паміж сабою. Дрэнна і тое, што гэтая брыгада нерэгулярна атрымоўвае паўфабрыкаты: фрэзэры для фрэзэроўкі, раўкі, шарнір-вар штаты і г. д.

Заводзкі камітэт таксама не ўдзяляе належнай ўвагі брыгадам.

**ВОКА.**

**Нататкі юнкораў**

# Ішлі стройнымі—плячо ў плячо—калёнамі

Да першай гадавіны соцспаборніцтва комсамольцы Фрунзаўкі прышлі з вялікім багажом дасягненьняў. Комсамолія „Комунара“ з гонарам білася за Чырвоны сьцяг, які атрымала паўгода назад. Прамфінплян выканан на 104 проц. Акрамя гэтага выпусьцілі продукцыю, непрадугледжаную прамфінплянам,—яны далі звыш пляну камнедрабілкі для пасеўкампаніі. Сабекошт прадукцыі заводу зьніжаны на 29 проц. замест 26 проц., намечаных па пляну. Комсамольцы прымалі актыўны ўдзел у гаспадарчым жыцьці заводу. Штодзённым удзелам у працы вытворчых нарад, яны былі застрэльшчыкамі ўдарніцкага руху заводу. Не адстае і комсамолія „Кастрычніка“. Яна прымае актыўны ўдзел у ліквідацыі студзеньскага прарыву, організацыя вытворча-бытавой комуны, якая дала падвышэньне вытворчасьці працы на 40 проц. Дзякуючы ініцыятыве комсамолу організаваны групы рацыяналізатараў, якія адыгрываюць значную ролю ва ўсім гаспадарчым жыцьці прадпрыемства.

Комсамольцы „Эльводу“ не дадуць адстаць „сэрцу“ гораду Менску—„Эльводу“ ад агульных тэмпаў будаўніцтва. З ударнай маладзёжнай брыгады вырас ударны цэх, які атрымаў прэмію за добрую працу. „Эльвод“ выканаў прамфінплян на 105 пр.

Рапартуе першая друкарня. Уся комсамолія друкарні жыве змаганьнем за падняцьце вытворчасьці. Відаць, як упарта, з дня ў дзень, з маленькіх дасягненьняў асобных комсамольцаў, рабочых растуць лічбы выкананьня прамфінпляну, павышэньня вытворчасьці.

### Мобілізуемся на барацьбу з здраднікамі

Комсамольцы бязьлітасна білі па тых, хто перашкаджаў альбо не хацеў працаваць разам з намі. Лжэўдарнікі і рвачы, душыцелі соцспаборніцтва, атрымалі дружны адпор ад перадавой комсамоліі.

— Трэба моцна біць па параднасьці соцспаборніцтва і ўдарніцтва, прыгожыя словы бяз працы не ўласьцівы бальшавікам. Ня трэба забывацца на тыя абяцаньні, якія мы даем у часе ўрачыстасьці, трэба іх памятаць, змагацца за іх выкананьне,—гаворыць прадстаўнік ЦСПСБ.

Лжэўдарнікі, якія хацелі выкарыстаць ударніцтва, каб тужэй набіць свае кішэні, былі выкрыты на „Комунары“, „Эльводзе“, „Дрэваапрацоўшчыку“ і інш.

Але не заўсёды пачынаньні комсамолу атрымоўваюць належную дапамогу і падтрыманьне ад адміністрацыі, а часта і ад партячэек. Галавацяпы яшчэ здорава тармозяць працу комсамолу. На ф-цы „Комунар“ комсамольская ячэйка ўзялася за організацыю ўдарных брыгад. Пачалі працаваць. Але... „Чаго вы так сьпяшаецеся?—пытае інжынэр,—сыравіны няма, папрацуеце дзьве гадзіны, а далей будзеце стаяць. І нічога з вашага ўдарніцтва ня выйдзе“. Вось што б'е па прамфінпляну, вось чаму фабрыка „Комунарка“ не дадала краіне 27 пр. продуктаў. На заводзе „Комунар“ комсамольская ініцыятыва па організацыі ўдарных брыгад ня была падтрымана партыйнай ячэйкай заводу.

Комсамол патрабуе: больш увагі і практычнай штодзённай дапамогі ў працы комсамолу і рабочай моладзі на вытворчасьці ад гаспадарнікаў, партыйцаў і профсаюзаў.

### Падцягнуць адсталых

„Беларуска“ адстала на гэтым вучастку. Так констатуе конфэрэнцыя, аб гэтым гаворыць і сэкратар ячэйкі КСМ фабрыкі ў сваім рапарце. У першым квартале 29-30 гаспадарчага году мы мелі прарыў—недавыкананьне прамфінпляну па ўсіх цэхах фабрыкі. Асабліва адстаў гузікавы цэх, які выпушчае вялікі процант браку. „Беларуска“—кандыдат на чорную дошку. Комсамольцы фабрыкі, якія дагэтуль ня ўключыліся ў соцспаборніцтва, якія ганебна адсталі ад жыцьця, хочуць дагнаць. Комсамолія фабрыкі ўзялася за працу. Аб гэтым гаворыць уздым усяе грамадзкасьці фабрыкі на барацьбу з прарывамі, на барацьбу „з конкрэтнымі носьбітамі зла“. Фабрыка рыхтуецца да барацьбы. Яе шлях—ад чорнай да чырвонай дошкі.

Невыстарчальна разгорнута соцспаборніцтва і на заводзе „Дрэваапрацоўшчык“.

### Рапартуе комсамол з рыштаваньняў

Будаўнічы сэзон пачаўся. Комсамольскі колектыў Белдзяржбуду мае восем ударных брыгад, ударную маладзёжную пабудову, адно ўдарнае прадпрыемства. Праца ўдарных брыгад дала падвышэньне вытворчасьці: па каменна-тынкавальнай брыгадзе на 40 проц., арматуршчыкаў—50 проц., плотнікаў—18 проц., школы будвучу (па абодвых цэхах бэтонным і водаправодным)—70 проц. Зьніжаны расцэнкі: плотнікаў на 5 проц., арматуршчыкаў на 8 проц. Эканоміі па сьлясарным цэху, цэнтральных майстэрнях Белдзяржбуду ў выніку выкарыстаньня мэталёвых адкідаў—6000 руб., 600 рублёў мелі ўжо ў пачатку працы маладзёжных пабудоў. Ёсьць і недахопы. Ударная брыгада муляроўтынкавальнікаў, у якой з 32 членаў больш 20 комсамольцаў, мела 12 вымоў ад адміністрацыі за дрэнныя адносіны да працы. Комсамольскі колектыў Дзяржбуду належным чынам ацаніў гэткую працу „ударнікаў“. Яны былі пазбаўлены званьня ўдарнікаў.

Па комсамольскім колектыве Менбуду мы маем: 4 ударныя брыгады, зьнізіўшыя каменна-тынкавальныя расцэнкі на 15 проц., брыгада кавалёў—на 12 проц., сталяроў—10 і страгальшчыкаў—5 проц. 3 ударныя пабудовы, даўшыя зьніжэньне сабекошту будоўлі ў сэзоне 29 году на 15 проц. і ў бягучым сэзоне на 12 проц. З іх 8 проц. за кошт мэханізацыі і 7 проц. эканоміі матар'ялу. Гэтыя дасягненьні мы маем да пачатку будаўнічага сэзону.

### Рабочая моладзь—у шэрагі комсамолу

Практычная праца комсамолу на вытворчасьці зрабіла комсамол штодзённым практычным кіраўніком усяе рабочае моладзі.

Рабочая моладзь ідзе ў комсамол, каб разам з ім змагацца і працаваць. „Трэба, каб уся наша конфэрэнцыя акомсамолілася“,—гаворыць тав. **Палякоў**. Мы сталі на шлях да выкананьня гэтай задачы. Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы:

На заводзе „Комунар“ падана 52 заявы ў комсамол, на „Кастрычніку“—34, Дрэваапрацоўшчыку—13 і Белдзяржбудзе—13. Усяго—128 новых байцоў. Наша армія расьце. Праводзячы ўсю гэтую працу комсамол павінен памятаць аб небясьпецы вайны, павінен узмацняць вайсковую працу комсамолу. Ня трэба забываць нашых замежных братоў,—комсамол павінен узмацніць шэрагі МОПР'у. Узмацнім шэрагі комсамолу і беспартыйнай моладзі да далейшай барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

**Брыгада юнкораў**
**І. Ш., Е. Э., Еф. Б.**

БЕЛАРУСКІ ТРАМ

# ПЕРШЫ ШТАНДАР

**Беларускі тэатр рабочай моладзі зараз рыхтуе свой першы спэктакль, напісаны, аформлены і падрыхтаваны самімі-ж трамаўцамі.**

**Спэктакль расказвае аб гэроічных буднях ударнікаў пабудовы заводу сельска-гаспадарчых машын. Спэктакль кліча да напружанай барацьбы за соцыялістычныя тэмпы работы.**

**Мы павінны ўважліва азнаёміцца з творчай работай ТРАМ'у—гэтага дзецішча комсамолу Беларусі.**

**Друкуючы сёньня ўрывак з спэктаклю ТРАМ'у „Першы Штандар", рэдакцыя маркуе ў бліжэйшы час больш шырока паказаць на сваіх старонках работу ТРАМ'у.**

## Будні комуны

### КРУГІ
### Абразок І

Памяшканьне вытворча-бытавое комуны пабудовы заводу сельска-гаспадарчых машын.

Сцэна—спальня памяшканьня комуны. На сцэне загадчык гаспадаркі комуны—дзяўчына, дзьве дзяжурныя.

ЗАГ. ГАСПАД:—(працуе пад рэглямантам комуны, чытае)

... пад'ем працуючых на першай зьмене—а шостай гадзіне раніцы. Мыцца на рэчцы. Сьнеданьне—20 проц. усіх дзённых харчоў... А як я вылічу проценты?.. Пад'ём другой зьмены... (устае). Ох! Цяжка, братва... Комуну мы організавалі.

„Вытворча бытавая комуна імя Карла Лібкнехта на пабудове заводу сельска-гаспадарчых машын"... Крычалі „ура", гаварылі прамовы... А вось будні комуны ўпарадкаваць ды 100 проц. карысьці наладзіць куды цяжэй...

1-АЯ ДЗЯЖУР: (з гумарам)—Тварыш загадчык гаспадаркі, дазвольце дзяжурным схадзіць на рэчку.

ЗАГ. ГАСПАД.: Правільна. Працу ўдарных брыгад паставілі на вышэйшую ступень. Такой вытворчасьці, такой дысцыпліны пабудова ня бачыла. Сталі зьнітаваным колектывам

2-АЯ ДЗЯЖУР.: Алеська! Пусьці пакупацца. Мы пасьля скончым прыбіраць.

ЗАГ. ГАСПАД.: Але цяжкасьцяй—вагон. Па-першае: комуна мы, ці вытворча-бытавая арцель? Ці трэба абагульваць скрынкі? Працуем па адной разьліковай кніжцы... Бязумоўна, у нас агульныя:..

1-АЯ ДЗЯЖУР.: Усе купацца пашлі, а мы тут... пакутуем.

ЗАГ. ГАСПАД.: Агульная ў нас праца, кватэра, харчы. Разам чытаем, вучымся, глядзім кіно. А як быць з адзежай? Толькі любіць што-небудзь новае надзець, а Пятрусь—абношанае, тое, што ўжо ўлеглася кожнай зморшчынкай. Аднаму на адзежу трэба больш, другому—меней...

1-Я ДЗЯЖУР.: Гэта сьвінства!. Алеська, мы таксама людзі!.. (кідае венік і выходзіць).

ЗАГ. ГАСПАД.: А адпачынак? У Сёмкі ные сэрца па сэкратаршы... Пагаварыць сам-на-сам хочацца, ручку паціснуць, а то і... пацалавацца... А тут круглыя суткі на вачох... Хіба выкрэсьліць каханьне з інвэнтару комуны?...

1-АЯ ДЗЯЖУР.: (паказваецца) Грышку прывітаньне перадаць? (сьмех, вышла).

ЗАГ. ГАСПАД. Што за жарты?... Куды вы?... (паўза) Што-ж я тут буду мух карміць?.. (кідае рушнік і выходзіць).

(Аркестр ціха пачынае іграць марш. На сцэну выходзяць у майках з рушнікамі комунары. Ідуць фігурнай маршыроўкай).

(Цёмна. Палавіннае асьвятленьне; комунары сядзяць).

ГАЛАСЫ: Далей. Далей. Расказвай, Быхаў! Вось гэта, браткі, політчас! Цішэй...

БЫХАЎ: Так, братва... Усе мы ведалі—раніцою сьмерць. Сьціснулі белыя як у пастку. З аднаго боку шуміць мора, з другога навісьлі скалы, з трэцяга—агонь, жалеза. кроў. Хто быў слабейшым—зажурыўся. Паніка пагражала атраду... І раптам — гармонік. Кінуў „яблычка" наш політрук, з прысьвістам пачаў удалыя частушкі...

(Гармонік іграе, запявала за сцэнай)

Пароход идёт, волны кольцами,
Будем рыбу кормить добровольцами.

РАБАЧКОМ: Загарэлася братва. Калі ўжо і паміраць, дык з музыкай (чуваць танец). Сьпявалі і скакалі ўсю ноч... А раніцой—полк белых пасеклі на капусту, два танкі голымі рукамі ўзялі. Выскачылі з пятлі... (гармонік цішэй)... А політрука разам з гармонікам, шрапнэль... на кавалкі... (гармонік візгнуў... цішыня)

УДАРНІЦА: Вось быў час.

СЦЭПУРКА: Шкадую я, хлапцы, што не радзіўся на 10 год раней. Рукі ў мазалёх, а пораху ня нюхаў... Пра гэроізм ведаю толькі з апавяданьняў...

ЯНКАЎ: А зараз гэроізм не патрэбен?

УДАРНІЦА: Усё-ткі ня тое, браткі.

МАРЫЛЯ: Але, ня той час. Крыві няма, сьвісту куль ня чуваць... Толькі гэроізму яшчэ больш патрэбна. Колькі працы, каб дагнаць і перагнаць эканоміку Амэрыкі, каб кожны мэтр зямлі ўзрэзаць трактарам, кожную хату асьвятліць электрычнасьцю.

СЦЭПУРКА: Цяжкая, марудная праца... вынікі пабачаць нашы ўнукі.

ВУЛЬФ: А ты ведаеш, што зараз мы выпускаем сельска-гаспадарчых машын ужо на 11 проц. больш, чымся Амэрыка выпусьціла ў 1928 годзе?

ГУРВІЧ: Праз два гады па вытворчасьці сельска-гаспадарчых машын мы будзем першай дзяржавай ў сьвеце?

СЦЭПУРКА: Справы гэроічныя... Але-ж дзе людзі гэрої?

БЫХАЎ: Глянь навакол сябе. Кожная хвіліна, кожная праца нараджае гэрояў. У шахтах, у вадзе, пад зямлёй, скрозь навальніцы, туман, перашкоды пракладаецца шлях у сонечную краіну. Такога часу, такой гэроічнай эпохі ня было ніколі. Нам Захад пагражае крыжам, яшчэ курыць на Усходзе Маўзэр. На нашых межах—груды дынаміту. Шмат хто з вас умацуе гарачай крывёю барыкады сталіц Эўропы. А зараз мы — жалезныя палкі, ударныя брыгады працоўнай арміі... Хто скажа, што фронт будаўніцтва ня варты ордэнаў Чырвонага Сьцягу'. Хто адважыцца сказаць, што зараз няма энтузіястаў, няма гэрояў?.. Гляньце навакол сябе.

(Кіно наплыў; выезд на мяжу—абараняем; праца ў шахтах, у вадзе, у паветры; будаўніцтва, лава коньніцы.

Аркестар іграе „На барыкады".

Рух наперад).

(Цемра)

## Лодачная станцыя г. Менску



Нядаўна адбылося ўрачыстае адчыненьне лодачнай станцыі дрэв... цовачнікаў на станцыі маецца 17 розных лодак і вадзяных лыж.

НА ЗДЫМКУ зьверху: лодачная станцыя, ўнізе: язда на вадзяных л...

### ДОМ КОМАСЬВЕТЫ

**Сёньня, 4-га мая г.г. а 8 гадз. увечары**

**АДБУДЗЕЦЦА ДАКЛАД**

**для партыйнага і комсамольскага актыву**

**аб „ДНЮ ДРУКУ"**

**Пасьля дакладу мастацкая частка.**

**Білеты па РК КП(б)Б і ЛКСМ.**

## Падпіраюць дошкамі, а ў гэты час...

Шмат пісалася ў друку аб недахопе будаўнічага матар'ялу, а калі зацікавіцца становішчам нашых пабудоў, дык мы заўважаем вельмі нядбайныя адносіны да гэтых матар'ялаў. На шмат якіх пабудовах адчуваецца вялікі недахоп дошак. Белдзяржбуд прыкладае ўсе патугі, каб здабыць найбольшую колькасьць гэтага матар'ялу.

На пабудове сельска-гаспадарчай выстаўкі вырытыя для каналізацыі канавы падмацоўваюцца новымі дошкамі, а між тым на некаторых пабудовах праца амаль што спыняецца з-за недахопу гэтых самых дошак. На пабудове Домбуду для тынкароў робяць рыштаваньні з новых дошак, на пабудове унівэрсытэцкага гарадка гэтыя козлы ляжаць цэлымі куч... пабудове Домбуду ў розны... дзе закінута шмат дым... труб, а ў гэты час у вод... чыкаў Белдзяржбуду быў прастой у працы якраз дз... недахопу гэтых труб. Усе факты гавораць за тое, ш... шы гаспадарчыя органы гэтага часу не навучыліся ... ваць працу між пабудова... будаўнічыя рабочыя яшчэ вучыліся ўважліва сачыць ... тоўным будаўнічым мата... Гэта сьведчыць аб тым, шт... самольскі колектыў Белдз... не праяўляе на гэтым фро... лежнай ініцыятывы, а г... дзесяткі тысяч рублёў стра...

Еф. КОЗЫР...

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

А.-ч Р.—„Скрыўленьне партыйнай лініі шкодзіць колгаснаму руху", Шэндараву Зьм.—„Політычны экзамін вытрыман слаба", Штальбергу—„У парадку абгаварэньня", Крайко—„Матараўская ячэйка ЛКСМБ", Кукушкіну—„Больш увагі фізвыхаваньню", Г. Варэйку—„Даволі спаць", Слухачу Ч.—Дапамажэце колгасу „Новы Шлях", М. Зорцы і М. Выкры... „Ненармальнае зьявішча"; Ко... цу—„Ліст у рэдакцыю", Ку... „Колгас пад пагрозай зрыву пасеўкампаніі", М. Чубару—... ваем кулакоў" і Ц. Л-кі—контрэвал."—накіраваны ў ... дныя органы для расьсьледв...

**Адказны рэдактар—Рэдколегія**

## Савецкі закон абараняе юнкораў

Юнкор Знаецкі напісаў допіс у нашу газэту пад загалоўкам: „кулакі з'агітавалі". Гэты допіс мы накіравалі на расьледваньне ў Нараўлянскую сэкцыю РСІ для выяўленьня правільнасьці апісаных фактаў і прыняцьця адпаведных захадаў, калі гэтыя факты акажуцца правільнымі.

Праз некаторы час мы зноў атрымоўваем заяву ад юнкора Знаецкага ўжо аб тым, што работнікі Нараўлянскага РВК выдалі яго прозьвішча асобам, аб якіх ён пісаў у допісу.

Сэкцыя РСІ ня толькі не дала сваечасовага адказу рэдакцыі аб выніках расьледваньня, чым парушыла пастанову ЦКК і НК—РСІ аб парадку рэагаваньня на крытыку прэсы, але і выдала прозьвішча юнкора, чым парушыла абежнік вярхоўнага суду рэспублікі БССР № 1 ад 16 красавіка 1925 г.

Надаючы вялікае політычнае значаньне рабселькораўскаму руху, асабліва на даным этапе, рэдакцыя гэта зьявішча лічыць ні ў якім разе недапушчальным, а таму рэдакцыя ўсю гэтую справу накіравала нарсьледчаму Нараўлянскага раёну (Мазыршчына) для тэрміновага расьледваньня і прыцягненьня вінаватых да крымінальнай адказнасьці паводле 104 пункту „Б" ці 117 арт. крымінальнага кодэксу.

Гэтымі днямі мы атрымалі адказ на дасланую справу ад сьледчага 1 вучастку Мазырскай акругі з дадатковым паведамленьнем:

„Сутнасьць нататкі комсамольца Знаецкага: „кулакі з'агітавалі"—аб п'янцы працаўнікоў сельсавету—падцьвердзіліся. Тыя асобы (старшыня сельсавету, настаўнік) з працы ўжо зьняты.

Старшынёй Нараўлянскай РСІ зьяўляецца нарсудзьдзя Хархурын і такім чынам нататка ваша (чытай рэдакцыі), пасланая ў РСІ, папала ў суд. Сэкратаром суда служыў гр-н Мікіценка Паўла—удзельнік тае п'янкі, аб якой пісалася ў нататцы.

Дзякуючы таму, што старшыня РСІ—ён-жа нарсудзьдзя Хархурын няўважліва хаваў допісы, Мікіценка меў магчымасьць прачытаць нататку, зрабіць з яе выпіску і дазнацца аб аўтары, а потым расказаць аб гэтым выкрытым нататкай асобам.

Раённая РСІ паслала допіс у орыгінале на расьсьледваньне сэкратару Куставаўніцкай партыйнай ячэйкі тав. Ненартаву. Апошні ўзяў ды афіцыйна допытаў па сутнасьці допісу яго-ж аўтара, чым парушыў асноўныя правілы, што аўтары допісу не павінны фігураваць сьведкамі па справе.

Усё гэта ўстаноўлена сьледчым Энціным, які паведаміў рэдакцыю, што Мікіценка ўжо зьняты з працы і аддаецца суду па 211 арт. крымінальнага кодэксу, а адносна Хархурына Нянартава матар'ял накіраваны ў мазырскі АК РСІ".

Мы лічым, што комэнтарыі да гэтай справы непатрэбны. Галоўнае, што трэба дадаць—гэта тое, што справа гэта павінна паслужыць прыкладам для тых, хто яшчэ лічыць, што праца юнрабселькора гэта „нішто", што юнкор—гэта „дробязь", на якую не зварочваюць увагі.

Гэта справа павінна яскрава пераканаць такіх людзей у тым, што мы заўсёды пастаім за юнкора.

Дык няхай гэта справа паслужыць прыкладам для астатніх.

Ц. В.

## Камбінатаўцы нічога ня робяць!..

Лёзунг 100 проц. уцягненьня рабочай моладзі ў ЛКСМБ колектывам Бабруйскага камбінату яшчэ не ўсьвядомлены. Ужо прашло некалькі месяцаў, а росту комбінату за лік рабочай моладзі не заўважваецца, за выключэньнем комсамольскай ячэйкі школы ФЗВ, якая ўцягнула ўсіх дзяцей рабочых у комсамол і зараз праводзіць работу па ўцягненьню з новага набору. А паміж тым на комбінаце маецца шмат рабочай моладзі, якая жадае працаваць у комсамоле.

Колектыў аб'ядная 12 ячэек з колькасьцю 250 комсамольцаў. Ніякіх конфэрэнцый рабочай моладзі, ніякай масавай працы сярод моладзі не праводзіцца.

Юнкор.

**МенАК ЛКСМБ у гэтым годзе адчыняе**

**Дом Адпачынку,**

**які будзе існаваць з 15-га мая да 1 га верасьня г.г.**

**УСЕ ЭКАНОМ-ПРАЦАЎНІКІ ПАВІННЫ ЗДАЦЬ СЬПІСЫ**

**жадаючых ехаць у Дом Адпачынку да 8-га мая,**

**БО 400 МЕСЦ УЖО ЗАНЯТА. У выпадку несваечасовай падачы сьпісаў яны застануцца бяз месц у Доме Адпачынку.**

**Сьпісы прымаюцца ад 9-ці да 4-х гадз. дню штодзённа і ад 6-ці да 7 з пал. увечары.**

Заг. Мас.-эканом. адд. Мен. АК ЛКСМБ ГОЛЬДБЭРГ

## Да ведама студэнтаў завочнікаў

Дэканат менскага завочнага рабфаку даводзіць ведама студэнтаў, што з 20 па 25 мая г. г. адбудзе... праверка ведаў студэнтаў і конфэрэнцыя з акадэмі... адсталымі таварышамі.

Для атрыманьня літара з 50-проц. скідкай па... гунцы ўсім студэнтам да вызначанага тэрміну неабх... на хутка паведаміць рабфак аб прыезьдзе на конфэр... цыю альбо для праверкі ведаў. Адначасова паведам... назву чыгуначнай станцыі, з якой патрэбна выяжджа... палустанку і разьезду пісаць ня трэба.

Нам. дэкана рабфаку ЯКАЎЛЕЎ.

5 МАЯ Ў ДОМЕ ПІСЬМЕНЬНІКА АДБУДЗЕЦЦА

**ВЯЛІКІ ВЕЧАР**

**прысьвечаны дню друку з наступнай програм...**

**1. ДАКЛАД** „пісьменьнікі і друкаванае слова"

**2. КОНЦЭРТ**

СЬПЕВЫ, СКОКІ, БАЛЕТ, МАСТАЦКАЕ ЧЫТАНЬНЕ, МУЗЫКА І Г.

3. У парадку самадзейнасьці—гульні. чытка новых твораў, гумар.

Запрашаюцца пісьменьнікі і іх сем'і. для я іх уваход в... іншыя па запрашальных білетах, якія можна атрымаць у з... чыка Дому Пісьменьніка.

**ПАЧАТАК А 8 Й ГАДЗІНЕ.**

Праўленьне Дому Пісьменьніка

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599